аднаго боку, менавіта ў П. адбываўся хрэсны ход на Вялікдзень, а з другога,— гэта быў час разгулу нячыстай сілы; дзяўчаты варажылі аб замужжы і адбываўся «продаж» душы чалавека д'яблу. У магічнай практыцы шырока выкарыстоўвалася соль, перапаленая менавіта ў П. Складанасць і супярэчлівасць успрыняцця П. абумоўлена статусам пераходнасці, маргінальнасці, амбівалентнай двухскладовасці. Да такіх момантаў (становішча цяжарнай жанчыны, дарога вясельнага поезда або пахавальнай працэсіі) заўсёды ставіліся з асаблівай насцярожанасцю. Па статусе рытуальнай значнасці вылучаліся 1-я Калядная, 2-я Калядная (Навагодняя), Велікодная, Купальская П. Кожная з іх мела лёсавызначальны характар і выкарыстоўвалася людзьмі як праграміруючы сегмент каляндарнага кругазвароту. Калядныя П. святкаваліся ў адпаведнасці з прынцыпам: «Як сустрэнеш Новы год, такім ён і будзе». Уся сям'я збіралася за святочным сталом, каб на працягу года ніхто не захварэў і не памёр. У Вялікодную і Купальскую П., наадварот, дома заставацца было нельга— усе збіраліся да хрэснага ходу вакол храмаў або вакол купальскага вогнішча, каб забяспечыць сябе надзейнымі абрадавымі абярэгамі і далучыцца да рытуальнага дзейства ўсёй вясковай абшчынай. У некаторыя святочныя П. (напрыклад, Посная Куцця) трэба было пачынаць усе сялянскія справы (напрасці, наткаць, звіць вяроўку і інш.), каб на працягу года гэтыя работы лёгка даваліся.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1. Зямля стаіць пасярод свету... Мн., 1996; К р у к Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. Мн., 2001; К р у к Я., К о т о в и ч О. Колесо времени: традиции и современность. Мн., 2003. С. 120—121.

*А. В. Катовіч.*

**ПО́ЎНЯ**. У традыцыйнай культуры беларусаў лічылася адмоўным часам, патрабуючым асаблівай увагі і перасцярогі, бо стаяла ў адным шэрагу з маргінальнымі перыядамі сутак — *поўначчу* і *поўднем*. Шырока распаўсюджана ўяўленне, што ў П. адбываецца пераважная большасць забойстваў, самагубстваў, катастроф, здарэнняў, канфліктаў і сварак. У гэты час людзі засцерагаліся, каб святло Месяца не трапіла на чалавека або жывёлу, што магло справакаваць узнікненне лунатызму. У некаторых мясцовасцях верылі, што твар стане непрыгожым і чалавек хутка захварэе. Здаўна з П. была звязана вялікая колькасць абмежаванняў. Раілі ўстрымлівацца ад падарожжаў, пачынаць доўгатэрміновую справу, ладзіць вяселлі і інш. П. максімальна «напаўняла» жывыя арганізмы вадкасцю, таму ў гэты час не нарыхтоўвалі дровы і «будаўнічы матэрыял» для новай хаты — усё згніе або драўніну паточаць чэрві; не абразалі і не прышчэплівалі дрэвы, каб яны не гублялі жываносны сок; гаспадыні лілі менш малака, каб зварыць, клалі менш мукі для выпечкі хлеба — «іначай будзе пералівацца цераз край». Забаранялася пазычаць ці аддаваць што-небудзь выносіць з хаты, каб не вынесці «сваю поўню» — шчасце, дабрабыт і інш. Верылі, калі закаханыя «перайдуць» месяцовую дарожку ў П., яны ніколі не будуць разам. Існавалі і станоўчыя моманты ў час П., якія спрыялі некаторым справам. Печнікі клалі новую печ у самую П., каб яна доўга захоўвалася і не рассыпалася. Раілі зачынаць сяўбу, каб «калоссе» было поўным, сеяць зеляніну (без пладоў) і траву для жывёлы. У некаторых рэгіёнах сеялі або саджалі «круглую» гародніну (гарбузы, капусту), каб яны выраслі такімі ж вялікімі, як месяцовая П. У дзень П. замаўлялі «лунацікаў»: «Дай, Хрыстос, ноч, каб пачываць, а не брадзіць, не гуляць з заплюшчанымі вачамі луннымі начамі. Месяцу на небе стаяць, а рабу (імя) у пасцелі ляжаць. Амінь»; назапашвалі разнастайныя запасы — «штоб усюды было поўна ўсякага дабра». У П. на Месяцы можна выразна ўбачыць чорныя плямы, паходжанне якіх атрымала самыя розныя тлумачэнні ў нар. павер'ях і легендах. На Мазыршчыне казалі: «На Месяцы «адбіўся» той мужык, які працаваў у нядзелю — пахаў зямлюваламі. Бог пакараў яго за непаслухмянасць, бо ў нядзелю нельга працаваць». Найбольш распаўсюджанай была хрысціянізаваная легенда пра тое, што на Месяцы адлюстравалася забойства аднаго брата другім — самых першых бацькоў Адама і Евы: «Калі Каін забіваў свайго брата, на небе была П., якая адразу ж прыняла кроў першага пакутніка, таму месяц бывае чырвоны ў час знаходжання на гарызонце. Каб у памяці ў людзей не сцерлася першае зладзейства, Бог пакінуў на месцы адбітак забойства, які выразна відзён на ім і дагэтуль».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Літ.*: Толстая С.М. Полесский народный календарь // Славянское и балканское языкознанис. М., 1986; Крук Я., Котович О. Колесо времени: традиции и современность. Мн., 2003; Катовіч А., Крук Я. Веснавыя святы: Нарысы. Кн. 1. Мн., 2005.

*А. В. Катовіч.*

**ПОЯС**, апаяска, пас. Скураны, плецены, тканы ці віты з нітак. П. мае шматлікія магічныя ўласцівасці, найперш засцерагальныя — ахоўвае цела гаспадара ад хвароб, злых праклёнаў і ўздзеяння нячыстай сілы. Паводле нар. уяўленняў, чалавек, які паважае сябе і людзей, ніколі не сустрэне гасцей без П., што трактавалася праявай дурнога тону. Таксама баяліся, што з-за адсутнасці П. «да душы дабярэцца д'ябал», «на жанчын можа напасці бяздзетнасць». Загубіць, расперазаць П. для дзяўчыны азначала страціць цнатлівасць, а для мужчыны расперазацца — страціць кантроль над сваімі паводзінамі. М.Нікіфароўскі адзначаў: «З'яўленне без шапкі і басанож не выкліча здзіўлення ў прысутных так, як з'яўленне без апаяскі, якою бывае вяроўка, пута або нават лыка...». П. надаваў сілы ці захоўваў тую, якая была ў чалавека да гэтага. Малое дзіця ўрачыста падпярэзвалі П., жадаючы яму ў будучым здароўя, шчасця, дабрабыту. Парадзісе, наадварот, распускалі П., каб ён даў магчымасць увайсці ў жыццё новаму чалавеку. Многія павер'і, звязаныя з П., тычыліся вясельнага абраду: нявестам рэкамендавалася ў дзень Вяселля абматаць сябе над плаццем сеткай, «каб не ўздзейнічалі сурокі ведзьмакоў», апошнія часам у шлюбныя П. ўплятаюць вузкую металічную палоску. Нявеста ў якасці традыцыйнага падарунка дарыла бацькам мужа вытканыя ёю ж П. Маладых перад шлюбам звязвалі ручніком ці П., «каб звязаць на ўсё жыццё». Калі вянчаліся, то яны станавіліся на ручнік, пад якім папярок іх шляху ляжаў П. Нявесту ўводзілі ў хату жаніха за П. і, увайшоўшы, яна кідала на печ чырвоны П. — паднашэнне продкам новага роду. За сталом яна сядзела з П. на левай руцэ і выводзілі яе з хаты за яго ж. Развязванне маладым П. азначала тое ж самае, што і расплятанне касы сяброўкамі — пераход у новы статус. У будзённым жыцці П. таксама меў важнае значэнне: цяжарная жанчына, калі чаго-небудзь палохалася, засоўвала вялікі палец левай рукі за П.; пасля нараджэння дзіцяці цэлых 6 тыдняў яна не мела права адыходзіць далёка ад хаты, «каб не адвязацца», а калі такое здаралася, то за П. у якасці абярэгу быў нож. Зафіксаваны звычай, паводле якога дзяўчаты на *Юр'я* збіраліся каля хаты маладзіцы, якая выйшла замуж у мінулым годзе, і прасілі яе выкінуць ім свой П., «каб прычапіцца да яго», г. зн. выйсці замуж у гэтым годзе. Адмаўляць лічылася вялікім грахом. П. таксама разрывалі на маленькія кавалачкі і захоўвалі на дабрабыт і шчасце ў далейшым. Ён прысутнічаў і ў пахавальным абрадзе, бо загадзя быў сатканы «на смерць», ім маглі апаясваць (па перыметры) труну з нябожчыкам. Да цугляў каня прывязвалі П., за канец якога жывёліну вялі да могілак. Некаторыя даследчыкі тлумачаць гэта як узаемасувязь паміж «гэтым» і «тым» светамі. На Каляды па тым, як раскруціцца скураны П., кінуты на печ, дзяўчаты варажылі, у які бок яны пойдуць замуж, а па тым, «касматы» ці гладкі яго канец, — ці багаты надарыцца муж. У чыста гаспадарчым плане з П. звязвалі многія рытуальныя дзеянні і абрады. Пры першым выгане кароў П. абвязвалі рогі, «каб яны не адбіваліся ад падворка», а пастухам у торбу разам з ежай клалі спецыяльна сатканы паясок, «каб глядзелі за каровамі, а тыя каб не адбіваліся ад чарады». Перад Новым годам гаспадыня старалася ўсю жывёлу, птушку і рэчы «звязаць» П. папарна, каб на лета быў двайны прыплод. «Апаясванне» ад нячыстай сілы адбывалася шляхам раскручвання П. вакол сябе і «захрышчвання» яго крыжам, ды яшчэ дадатковым вымаўленнем засцерагальнай замовы («трайная засцярога»). Верылі, што падперазаўшыся П., вытканым з рэшткаў лёну за адзін дзень, можна было на *Радаўніцу* ці на *Дзяды* пабачыць твары памерлых родных. У казках П. выкарыстоўваўся як лесвіца-канат, каб патрапіць у трыдзевятае царства. У чараўнічых парадах П. рассцілалі папярок шляху *Цара вужоў* і яго працэсіі, каб атрымаць у падарунак *вужову карону* ці залатыя рожкі, а з імі і ўласцівасць прадказваць лёс, узбагачацца і г.д. П. выкарыстоўваўся ў нар. вольнай барацьбе, дзе сапернікі стараліся ўхапіць адзін аднаго за П., каб адарваць ад зямлі і перамагчы. Колер і багацце П. залежалі ад займаемага сацыяльнага становішча і за-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ